View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# ЗНІШЧЭННЕ ДЗЯЦЕЙ У ФАШЫСЦКІХ КАНЦЭНТРАЦЫЙНЫХ ЛАГЕРАХ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Д. У. Дубінін , г. Мінск

11 красавіка адзначаецца Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў. У гады Другой сусветнай вайны фашысцкі тэрор на акупаваных тэрыторыях, генацыд, лагеры смерці, наўмыснае знішчэнне мільёнаў людзей ва ўсёй паўнаце раскрылі нечалавечую сутнасць фашызму, які наклікаў на сябе нянавісць народаў усяго свету.

Вялізныя масы насельніцтва нашай краіны сталі вязнямі фашысцкіх канцлагераў. Па далёка не поўных дадзеных у лагерах смерці на тэрыторыі Беларусі нацысты знішчылі звыш 1400000 чалавек.

На акупіраванай фашыстамі тэрыторыі Беларусі было створана больш за 260 лагераў смерці і месцаў масавага знішчэння людзей,у тым ліку і 14 дзіцячых канцлагераў, дзе ў дзяцей выпампоўвалі кроў для параненых салдат вермахта.

У пачатку ліпеня 1941 г. нямецкімі захопнікамі каля вёскі Дразды быў створаны часовы канцэнтрацыйны лагер, які праіснаваў 2-3 месяца. У гэтым лагеры ўтрымоўвалася каля 100 тысяч савецкіх ваеннапалонных і 40 тысяч мірных грамадзян, у тым ліку і дзяцей. Каля лагера адбываліся масавыя растрэлы вязняў. Дакладна месца растрэлаў і пахавання вызначалася як "траншэя", прыкладна ў 500 метрах ад лагера. У гэтай траншэі пахаваныя каля 10 тысяч чалавек: мужчын, жанчын, дзяцей.

Найбуйнейшым лагерам смерці на тэрыторыі Беларусі з'яўляўся Малы Трасцянец, створаны СД у наваколлі Мінска. Усяго ў Трасцянцы гітлераўцамі было закатавана, расстраляна, спалена звыш 206500 грамадзян. Па колькасці знішчаных гэты канцэнтрацыйны лагер стаіць на трэцім месцы пасля Асвенцыма і Майданэка. Аналіз шматлікіх крыніц дае падставу зрабіць выснову, што ў Трасцянецкім лагеры смерці загінулі дзесяткі тысяч беларусаў, рускіх, палякаў, не менш за 80 тысяч замежных габрэяў, каля 60 тысяч габрэяў Беларусі [2].

Ахвярамі Трасцянецкага лагера нароўні з дарослымі былі і дзеці. Фашызм не прызнаваў ўзроставага адрознення. Дзяцей выкарыстоўвалі для правядзення бесчалавечых медыцынскіх эксперыментаў, бралі кроў на патрэбы Усходняга фронту. Адзенне і абутак (драўляныя чаравікі ) не адрознівалася па памеры паміж дарослымі зняволенымі і дзецьмі. Цацкамі для маленькіх вязняў былі гузікі, каменьчыкі, пустыя запалкавыя скрынкі, каляровыя нітачкі, шпулькі з-пад нітак. Але дзіця магло гуляць толькі ўпотай, інакш надзіральніца адбірала нават гэтыя прымітыўныя цацкі. У сваіх гульнях дзеці адлюстроўвалі тое, што яны бачылі ў навакольным акружэнні: адбор людзей у душагубкі, хваробу і смерць. Пазбаўленыя ўсякіх зносін са знешнім светам, дзеці не мелі ніякіх ўяўленняў нават аб самых простых рэчах. Асабліва пакутавалі дзеці больш старэйшага ўзросту, якія яшчэ памяталі ранейшае жыццё да вайны [3].

Праявай нечалавечай жорсткасці і садызму былі Азарыцкія лагеры смерці, створаныя гітлераўцамі ў прыфрантавой паласе ў сакавіку 1944 года напярэдадні адступлення. Нягледзячы на тое, што яны існавалі ўсяго толькі дзесяць дзён (з 10 па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

19 сакавіка 1944 гады), наступствы іх існавання жудасныя. Фашысты не спадзяваліся ўтрымаць свае пазіцыі і выкарыстоўвалі лагеры ў якасці заслону пры наступленні Чырвонай арміі. Грамадзянскае насельніцтва, у тым ліку і дзеці, ўжывалася ў якасці прыкрыцця на шляху наступлення савецкіх войскаў. На пярэдняй лініі абароны гітлераўцы абнеслі калючым дротам вялікія ўчасткі зямлі, загналі туды жанчын, дзяцей, старых і утрымоўвалі іх пад моцнай аховай без прытулку, ежы і вады. Усяго гітлераўцамі было назганяна больш за 50 000 непрацаздольных грамадзян – дзяцей, жанчын, старых, хворых. З іх засталося ў жывых 33480 чалавек. Наўмысна ў лагеры было дастаўлена шмат людзей, хворых на тыф, што спрыяла найбольш хуткаму распаўсюджванню хваробы. Гэтай акцыяй гітлераўскае камандаванне імкнулася заразіць тыфам як мага больш воінаў Чырвонай Арміі і знізіць іх баяздольнасць і наступальны парыў. Людзі ўтрымліваліся ў нечалавечых умовах. Зняволеныя размяшчаліся прама на зямлі, іх марылі голадам, не давалі вады, забаранялі разводзіць вогнішчы. Пры малым парушэнні або непадпарадкаванні вязні расстрэльваліся. У ліку вязняў гэтых лагераў былі і дзеці. З усёй колькасці зняволеных іх было больш за палову. Жанчыны, якія мелі дзяцей, збіралі іх на ноч у групкі па 15-20 чалавек, баранілі ад халоднай смерці. 18-19 сакавіка 1944 г войскі 65-й арміі 1-га Беларускага фронту вызвалілі з Азарыцкіх лагераў 33480 чалавек, з іх 15960 дзяцей ва ўзросце да 13 гадоў. Пасля выгнання гітлераўцаў з лагера «Азарычы» з трох тысяч воінаў Чырвонай Арміі, якія мелі кантакт з вызваленымі, восем адсоткаў, нягледзячы на прынятыя папераджальныя меры, захварэлі сыпным тыфам. Нямала вязняў, і асабліва дзяцей, якія ўжо былі вызваленыя, так і не ўдалося выратаваць [4].

Вось што гаварыў пра Азарыцкі лагер смерці на Нюрнбергскім працэсе галоўны абвінаваўца ад СССР Л. Смірноў: “У ходзе вайны, ужо маючы цяжкія страты, германскі фашызм пачаў практыкаваць новыя лютыя формы знішчэння мірнага насельніцтва. Так былі створаны ў Беларусі лагеры смерці не толькі для забойства людзей, якія знаходзіліся ў самім лагеры, але, перш за ўсё, для распаўсюджвання сярод мірнага насельніцтва і ў радах Чырвонай Арміі вельмі цяжкіх інфекцый. У гэтых лагерах не было крэматорыяў і газавых камер, але па справядлівасці яны павінны быць аднесены да ліку самых жорсткіх канцэнтрацыйных лагераў, створаных фашыстамі”[5].

Падобны лагер быў створаны ў чэрвені 1944 года на ўсходнім беразе Дняпра, у ім знаходзіліся звыш 3000 чалавек мірных жыхароў, сагнаных з Магілёва і бліжэйшых населеных пунктаў. Такога ж тыпу лагер смерці быў створаны на паўднёвы-ўсход ад Віцебска, з якога войскам 3-га Беларускага фронту былі вызваленыя каля 8 тысяч мірных жыхароў.

Найбольш жорсткі дзіцячы «кровазаборны» канцлагер існаваў каля вёскі Чырвоны Бераг Гомельскай вобласці. Тут ўтрымоўваліся дзеці ад 8 да 14 гадоў. Для здачы крові са Жлобінскага, Рагачоўскага, Добрушскага і іншых раёнаў Гомельшчыны адбіралі хлопчыкаў і дзяўчынак 8—14-гадовага ўзросту. На тэрыторыі былой панскай сядзібы іх мылі ў лазні, потым праводзілі медыцынскі агляд. Тых, хто падыходзіў, прыводзілі ў асобны пакой, саджалі на крэсла, руку прасоўвалі за агароджу ў спецыяльную адтуліну, потым выкачвалі кроў. Калі нехта з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзяцей пасля гэтай працэдуры падаваў прыкметы жыцця, яму змочвалі вусны атрутай. Потым маленькія трупікі спальвалі ў топках кацельнай.

Перад адпраўкай у барак канцлагера да малалетніх вязняў, што сядзелі на саломе, уваходзілі нямецкі афіцэр і прыгожая жанчына, якая з усмешкай гаварыла: “Хто хоча кашы, хутчэй станавіцеся па двое ў рад. Павядзём вас карміць…”. Есці хацелі ўсе, і ўсе імкнуліся ў той рад. Тыя, каго павялі есці кашу, назад ужо не вярталіся ніколі! Яны знікалі бясследна. Такіх было вельмі многа.

Тут у Чырвоным Беразе фашысты праводзілі так званыя “навуковыя” эксперыменты па збору крыві. Дзяцей падвешвалі пад мышкі і сжымалі грудзіну. Для таго, каб кроў не зварочвалася, рабілі спецыяльны ўкол. Скура на ступнях адразалася, або рабіліся глябокія надрэзы. Кроў сцякала ў герметычныя ванначкі. У выніку нечалавечых катаванняў і эксперыментаў 1990 дзяцей загінула. Вядомы імёны толькі 15 чырвобярэжскіх дзетак. Астатнія 1965 засталіся безыменнымі [1].

Больш моцных дзяцей зганялі на чыгуначнай станцыі ў цягнікі і адпраўлялі ў Германію, дзе таксама бралі кроў для параненых нямецкіх салдат і афіцэраў. Усяго за некалькі месяцаў з чырвонабярэжскага канцлагера з гэтай мэтай было вывезена амаль 2 тысячы дзяцей [1].  У Беларусі з 14 дзіцячых канцэнтрацыйных лагераў, толькі ў Гомельскай вобласці размяшчалася – 3: Чырвоны Бераг – 1990 дзяцей; вёска Лучыцы, Петрыкаўскага раёна – 190 дзяцей; горад Петрыкаў - 260 дзяцейі інш.

Нешматлікім вязням-дзецям, якія засталіся пасля фашысцкіх канцлагераў у жывых, Германія выплачвае кампенсацыю, але ўжо ніхто не зможа вярнуць гэтым людзям іх дзяцінства і ўжо ніхто не верне загубленыя дзіцячыя душы.

Літаратура і крыніцы

1. Асташкевіч, І. Чырвоны Бераг — крывавы бераг / І. Асташкевіч // Звязда. — 2009. — 2 ліп. — С. 1, 3.

2. Бутько, Н. Что вырастет на поле Тростенца? / Н. Бутько // Неман. — 2006. — № 11. — С. 166—173.

3. Ванькевич, А. Г. Экскурсия в Тростенец: фашистский лагерь смерти / А. Г. Ванькевич. — Мн. : Полымя, 1986. — 32 с.

4. Верас, Ф. Знать и помнить трагедию узников Озаричей / Ф. Верас // Юстыцыя Беларусі. — 2009. — № 4. — С. 78—79.

5. Верас, Ф. Правда о концлагере «Озаричи» забвению не подлежит / Ф. Верас // Народная воля. — 2009. — 17—20 крас. — С. 3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ